УДК 821

# МАЎЛЕННЕ ПЕРСАНАЖА ТВОРА ЯК СРОДАК РАСКРЫЦЦЯ ЯГО ХАРАКТАРУ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВОБРАЗА САРОКІ З «ПАЛЕСКАЙ ХРОНІКІ» І. МЕЛЕЖА)

***П. А. Леонава***
*курсант 1 курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС (Беларусь),*
*15 узвод*
*Навуковы кіраўнік:* ***М. М. Караткоў,***
*старшы выкладчык кафедры*
*сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС (Беларусь),*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Як спосаб выкарыстання моўных сродкаў маўленне неаднароднае. У кожным канкрэтным выпадку мова функцыянуе ў цеснай сувязі з патрэбамі і абставінамі зносін, іх формай. У творах мастацкай літаратуры часта назіраецца спалучэнне мовы літаратурнай (пераважна ў аўтарскім апавяданні) і гутарковай (пры перадачы мовы персанажаў). Зазначым, што аналіз маўлення куранёўцаў у «Палескай хроніцы» І. Мележа сведчыць, што яно мае як агульныя рысы, так і індывідуальныя асаблівасці.

Асабліва адметным з'яўляецца маўленне цікаўнай да ўсяго «гаварлівай удавы Сарокі, дужай, вяртлявай жанчыны» [1, с. 137]. Як зазначае аўтар, яна «часта забівала сваёй гаворкай» субяседнікаў, «якія нямелі ад патоку дасціпных прымавак і жартаў. Прымаўкі вязала яна лёгка, спрытна, без утомы, адкуль толькі і браліся!» [1, с. 137]. Жарты, прымаўкі Сарокі сведчаць аб яе практычным розуме, здатнасці да крытычнага асэнсавання рэчаіснасці. «Дзяцей поўны хорам, а сам як малы — і не сорам!» [1, с. 137] — упікае яна Зайчыка, які жартам заляцаецца да яе.

Не маючы мужа, Сарока мусіць быць актыўнай і ў грамадскіх справах, бо ад гэтага залежыць яе дабрабыт. І ў калектывізацыі яна адчувае, як і многія іншыя куранёўцы, яўную пагрозу. Нездарма на прапанову Апейкі дапамагчы ў касьбе адказвае: «Паможаш! З'арэш на далоньку, бяду навядзеш на Сарочыну галоўваньку! Скосіш на якую пятку, драбніцу — кулачкай назавеш маладзіцу! Маўляў, батракоў наймае! Сем патоў зганяе!» [2, с. 73].

Сароцы страшна пазбавіцца прывычнага ладу жыцця. Мяркуемае абагульненне маёмасці палохае — што з таго атрымаецца? «Жызня будзе: прыйдзеш з работы — ніякай турботы!… Ні каровы, ні свіняці — адны сцены ў

хаце!.. Любата!» — з сарказмам гаворыць яна [2, с. 132]. «Заскачаш, як у кадрылі, калі баішся, штоб чаго не намудрылі!» — так афарыстычна тлумачыць яна прычыну пагалоўнай яўкі куранёўцаў на сход па прычыне выдзялення лепшай зямлі калгасу.

Варта адзначыць і такую асаблівасць маўлення Сарокі, як арыгінальнасць некаторых яе прымавак і жартаў, наяўнасць у іх рыфмы, што сведчыць і аб пэўных яе паэтычных здольнасцях.

---

1. Мележ І. Людзі на балоце // Мележ, І. Зб. тв. : у 10 т. Т. 5. Мінск : Маст. літ., 1981. 415 с. Вернуться к статье
2. Мележ І. Подых навальніцы // Мележ, І. Зб. тв. : у 10 т. Т. 6. Мінск : Маст. літ., 1982. 573 с. Вернуться к статье